# Прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2011 года ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і аматарскай творчасці

## Прэзідыум Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі прысудзіў прэміі 2011 года ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і аматарскай творчасці з наданнем звання лаўрэата, уручэннем Ганаровага знака, дыплома і грашовай узнагароды:

I. За творы прозы, паэзіі і драматургіі (адна прэмія):

за кнігу "Снукер", апублікаваную ў 2009 годзе, **Ткачову Васілю Юр'евічу**, пісьменніку.

II. За музычныя творы, канцэртна-выканальніцкую дзейнасць (адна прэмія):

за песні апошніх гадоў на вершы беларускіх паэтаў (2007—2010 гг.) **Елісеенкаву Алегу Мікалаевічу**, кампазітару, дацэнту ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".

III. За работы ў галіне тэатральнага мастацтва і кінамастацтва (адна прэмія):

за стварэнне спектакля "Каласы пад сярпом тваім" паводле рамана У. Караткевіча ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі (2008 г.) **Анісенку Валерыю Данілавічу** (рэжысёру-пастаноўшчыку), **Шусце Марыне Аляксандраўне** (мастаку-пастаноўшчыку), **Сігаву Ігару Аляксеевічу** (артысту-выканаўцу галоўнай ролі) і **Сідаркевіч Людміле Аляксандраўне** (артыстцы-выканаўцы галоўнай ролі).

IV. За творы жывапісу, скульптуры, графікі і прыкладнога мастацтва (адна прэмія):

за стварэнне серыі пейзажаў "Зямля беларуская" (2007—2009 гг.) **Дамараду Сямёну Уладзіміравічу**, мастаку-жывапісцу, мастаку мастацкага ўнітарнага прадпрыемства "Мастацкі камбінат".

V. За актыўную работу па развіцці народнага мастацтва і аматарскай творчасці працоўных (адна прэмія):

дырэктару культурна-забаўляльнага рэспубліканскага дачынага ўнітарнага прадпрыемства "Культсэрвіс" Мінскага трактарнага завода **Кіруту Уладзіміру Іванавічу**.

VI. За выдатныя дасягненні аматарскіх калектываў мастацкай творчасці (адна прэмія):

**народнаму хору ветэранаў працы "Славянскі сувенір"** Рэспубліканскага Палаца культуры ветэранаў, г. Мінск (хормайстар — Кузьміна Вольга Пятроўна).

VII. У галіне журналістыкі (дзве прэміі):

за распрацоўку канцэпцыі і падрыхтоўку матэрыялаў рубрыкі "Вяртанне імёнаў" і матэрыялы, прысвечаныя 65-годдзю Вялікай Перамогі, апублікаваныя ў газеце "Культура" ў 2010 годзе, **Крэпаку Барысу Аляксеевічу**, рэдактару аддзела газеты "Культура"; за цыкл праграм "Сацыяльнае партнёрства" на радыёстанцыі "Беларусь" (2008—2010 гг.) **Міцюшнікаву Рыгору Мікалаевічу**, загадчыку аддзела інфармацыйных і грамадска-палітычных праграм галоўнай дырэкцыі вяшчання на замежныя краіны Беларускага радыё (радыёстанцыя "Беларусь") Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь.

Грашовая ўзнагарода лаўрэатам індывідуальных прэмій Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2011 года ўстаноўлена ў памеры 2 600 000 рублёў кожнаму, калектыўнай прэміі за работы ў галіне тэатральнага мастацтва і кінамастацтва аўтарскаму калектыву (В. Анісенка, М. Шуста, І. Сігаў, Л. Сідаркевіч) — у памеры 1 400 000 рублёў кожнаму, а калектыўнай прэміі за выдатныя дасягненні аматарскіх калектываў мастацкай творчасці — у памеры 5 600 000 рублёў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ